БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланыя рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш петыту на 1-й стран. 1 руб на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 3. Менск. Аўторак 26 сакавіка 1918 г. Год I.

Менск 26/III.

Старшынёю выканаўчага камітэту Рады 1-го Усебеларускаго З'езду ад імені Выканаўчаго Камітэту і Народнаго Сэкрэтарыяту Беларускай Рэспублікі была адбіта дэпэша гр. Гэртлінгу, ў якой выказваўся пратэст проціў згоды на уступку Польшчы беларускіх зямель, якую гатова даць большасьць гэрманскаго Рэйхстагу. С тае-ж прычыны звярнулася с тэлеграмамі да канцлера, глаўнай камісіі Рэйхстагу і да окупацыйнай гэрманскай ўлады у Коўне і Менскае Беларускае Прэдстаўніцтва, якоя заявіло аб бажанні цэлакупнаго жыцця і нізалежнаго дзяржаўнаго істнення беларускаго народу, апіраючыся на заходнюю культуру.

За ўсе часы вайны і рэвалюцыі гэта можа першы выпадак толькі, што голас Беларускаго народу пачуўся за рубяжамі Расіі. Гаварылі аб паляках, аб украінцах, Ліцьве, Курляндзіі і інш., а аб нас нічога, хаця беларусы аб сабе ні маўчалі. Гэта і сталася прычынай, што факт пасылкі дэпэшы Народнаго Сэкрэтарыяту і Менскаго Прэдстаўніцта часьць гэрманскай прэссы ацаніла, як крыху прыпозьненыя, з'явіўшыся пасьля таго, як немцам завязаліся рукі мірным дагаворам у Бярэсьцю.

Афіцыяльнаго атказу на тэлеграмы пакуль што німа і няведама які будзя. Можа і Урад гэрманскі і Рэйхстаг так сама атказуць нам, што: «крыху за позна».

Гэта аднак ні павінна зацемняць нашай надзеі, або адбівацца на нашых бажаннях. Праўда, нас позна пачулі і гэта (хоць ні праз нашу віну) шкодзіць беларускай нацыянальна-дзяржаўнай справе. Але—«лепі позна, чым ніколі»;—добра і тоя, што нас усё ж такі пачулі! Цяпер мы павінны старацца, каб аб нас заўсёды помнілі і тады наша сьвятая справа затрыумфуе, ні уважаючы нават на Бярэсцкі акт, каторым Троцкі акрываўіў наша нацыянальнае цела.

Пасьля вайны.*)

II

Лес, вайна і адбудова.

Ці можна пабудаваць 200 тыс. хат з дрэва?

На хату—зруб, падлога, столь, кроквы, гонты і т. д. трэба 180 пнёў.

На 200 тыс. хат трэба 36 мільёнаў пнёў; дык трэба лесу сярэдняго на гэта 72 тыс. дзесяцін высеч у пень. На рэшту будоўлі трэба 197 тыс. пнёў.

Значыцца, каб пабудавацца старым фасонам толькі вёскам, трэба выкаціць 150 тысяч дзесяцін лесу; калі ешчэ прыбавіць мястэчкі, то будзе і 200 тысяч дзесяцін лесу. Значыцца абярнуць Беларусію у аравійскую пустыню. Ад гэтаго можэ і клімат зьмяніцца к горшаму. У Грэцыі выкацілі ўсе лясы на уклонах гор і клімат стаў надта сухі. Глаўнае наше багацце—лес.

Мы край лясных запасаў і дзеля Украіны і Гэрманіі, Англіі і Франціі.

Значыцца, вайна змела лясы, а адбудова дрэўняная зьмяце да канца.

100 гадоў прыдзецца чэкаць покуль край дойдзе да такога ляснога запасу, які быў прад вайной.

Але 100 гадоў чэкаць, значыцца 4 пакаленьні будуць бяз дрэва, і заработку. Трэба у Беларусі саўсім забараніць рабіць сцены з дрэва, каб ураваць край ад эканамічнаго банкроцтва.

Новыя способы будовы.

Мы відзім з гэтаго, што бежанцы першы год будуць ішчэ жыць, як амэрыканскіе фэрмары у романах Майн-Рыда, гдзе быў густы лес, а ў нас толькі пні. Трэба забыць саўсім пра стары способ будовы і стары плян. Трэба будавацца с цэглы, вапны і жалеза, трэба вырабіць тып гаспадарскай сялібы, каб было на 6 будоўлёў, а 1—2 унітарныя.

Такі тып выраблен у Прусіі і у Польшчы.

Архітэктар Лявон Дубейкоўскі цяпер працуець над гэтым; просім другіх нашых архітэктароў гэтым заняцца; беларускія арганізацыі павінны аб'явіць конкурс на тып будовы. Трэба, каб архітэктары і спэціалісты камандавалі адбудовай, бо ў нас тэхніка будоўляная стаіць візка і ў гарадох. У Франціі—нават на павет ёсць 2—3 архітэктора, бяз іх нават і малой будыніны ня робяць.

Цагельні і торф.

Трэба каб у кожнай воласці было 1—2 цагельні з Гофманскімі печамі, і каб выраблялі ішчэ торф дзеля апалу; зараз павінны зрабіць курсы дзеля усякіх спэцыальносцей.

Каб паставіць 200 тыс. печак, трэба 400 мільёнаў цэглы.

Каб зашкліць вокны ў хатах, трэба 19 мільёнаў вакон-ных шыб. На адны толькі хаты трэба каля мільёну пудоў цьвякоў. Трэба пусьціць цэлую кучу фабрык, каб усё гэта вырабіць.

Мы гэтыя усе рахункі прывялі, яны ні саўсім акуратны, бо трэба асобую перапісь зрабіць дзеля гэтаго, каб паказаць, якая вялізарная праца пасадзіць людзей на сваю зямлю, адкуль яны былі без патрэбы согнаны дзікім безумствам старой расійшчыны.

А. У.

*) Гл. № 2.

Куды пакіраваць нашыя сілы.

«Земля наша веліка і абільна»... далей знаем усё ад часоў ішчэ «Іловайскаго».

Беларусь пачалі ні заваёвываць, а акупіраваць Гэрманцы, прэдстаўнікі найлепш арганізованаго нацыянальнаго государства, гдзе праца, парадак, сыстэма ва ўсім дзівіць увесь сьвет.

Камандуючы клас чыноўнікоў, правіцялеў там густы, кожны цэлае жыцьцё «штудзіроваў» [разучываў] сваю спэцыяльнасць наскрось [durch].

Але народ там так сама ні быў стадам бараноў. Рабочы клас там, так сама весь ідзець у ногу і стройнымі радамі. Усерасейская інтэлігенцыя вырасла на «Эрфуртскай праграме»: студэнты па усей Расіі пелі: «Пьем за таго,
Хто пісаў «Капітал»,
За ідэалы яго».

Можа гэрманцы будуць акупіраваць Беларусь і год, і два і тут распараджацца.

Беларусь стане на ногі. Вайна пярэмалола так сьвет, што кончыцца ўсё свабодным разьвіцьцем усіх націй—у тым ліку і беларусоў..

Усе чуюць, што ў нас с ганяцьцям Беларусі гэрманцамі парваўся нейкі ланцуг. Як завеса ў тэатры запала.

Гдзе ўся расійская рэвалюцыя?

Адны яе цяпер толькі чэрняць, другіе апусцілі вушы і ня могуць ніяк апомніцца: можэ мы страцілі, можэ ішчэ рэвалюцыю трэба было «углубляць»..

Рэвалюцыя мела сваю агромную карысць: скінула цэнтралізм і самадзержавіе, разбудзіла народ, быўшы ў рабстве.

Толькі памыляліся людзі, думаючы, што у 5 мінут можна зрабіць «самых свабодных граждан на сьвеце».

Рэвалюцыя устрасанула народ і адкрыла яму дарогу да працы над устройствам жыцця, творчай працы на дзесяткі гадоў, крок за крокам.

Апошніе месяцы «рэвалюціі» было не стварэньня, а бурэньня.

Устройства грамадзянскаго жыцця настолькі прамудра і хітра зьвязана, што на «салдацкім мітынгу» яго нязробіш, пры цэлым нават акіане свабоднаго пустасловія, рэзалюцыяў і дэкрэтаў.

Вінаваціць толькі народ за тое, што ён рэвалюцыю рабіў на свой фасон, чалавек с шчырым суменням ні адважыцца. У гэтым вінаваты старые грахі выжейшых станаў.

Перараблйайце народ. Прапуйце. Цяпер німа перашкодаў.

Старасьвецкі.

Рэдактарскі сон.

Паэма ні паэма, а нешта «на кшталт таго».

Рэдактор брукоукі—
Соракгрошоукі,
Кладучыся спаць,—
Уздумау напісаць:
«У гэтым месьце старасьвецкім,
Слауным звычаям купецкім,
У гэтым сэрцу Белайрусі
«Кажды поляк мувіць мусі,
Ці у краме, ці на рынку,
Ці у кавярні, ці у шынку,
Ну усюды адным словам,
«Чыстон польскон пенкнон мовон».*)
Напісау і пазяхнуу,
Павярнууся і заснуу.
І вось бачыць пан рэдактар,
Яу-ні-яу і сон-ні-сон,
Бытцам, вышаушы с касьцелу,
Да знаемых цягнець ен.
Захацелася нібозе,
Каб цыгару запаліць,
Але-ж трапіла у дарозе
Партабачніцу згубіць!
«Ну, згубіу, дык ліха з ею,
Хоць то паменць еднэй дамы».
Так мурмочучы с сабою,
Пан рэдактар уходзіць у краму:
«Ту цыгары сон птавдзівэ?»
(Ні курыу ен папірос)
І атказ пачуу на дзіва:
«Іх фарстэй ніт вілт-ір вос».
Як ашпарэны. у другую
Забегая краму ен
І прэстауце рэч такую,
—І у гэтай той-жа сон.
Толькі тут на запытанне
Чуць другі пачуу адказ:
«Москвічі-с мы-с, не цыгане,
Невозможно-с понять с вас!».
«Ну й прыгода, ну й здарення!»
Бурай у трэццюю уляцеу:
«Сон цыгары до паленя?»
Запыхаушыся ускрычэу.
—«Сон то сон—гандляр гаворэ—
Гандлям толькі і жывем,
Але бачыш пане, горо:
—Ні сваім ні прадаем!
От каб пан па беларуску
Мне сказау»...—«Кей я не умем».
Што-ж рабіць. І я па польску
«Ані слувка не розумем»!
Пан рэдактар злаяу, плюнуу
І задау с тэй крамы драла.
Верст с чатыры мусіць дунуу,
—Злосьць, бач, вельмі яго узяла—
Даляцеу да нейкай крамкі
І крычыць с парогу пан:
«Сон цыгары? Есть сігары?
Есьць цыгары... ну, цігары ту фаран?!»
У краме тут як паднялося...
Збегся слухаць цэлы двор,
Бо хадзяіну здалося,
Што рэдактар—«крышку хвор».
—«Каб вы самі звар'яцелі»—
Пан рэдактар на уцек,
І... прачнууся у пасьцелі.
Ныу па ціху левы бок...
Мыш пабегла у куточак...
Недзе певень горла драу...
Узяу рэдактар свой лісточак
І са злосьцю разадрау.

Сальвэсь.

*) «Placówka» № 37 артыкул Elementarny obowiązek».

Па сьвеце.

ФІНЛЯНДЗІЯ. 21 г. м. згодна с паведамленнем «Cowierc della Sera», бальшэвікі пакідаюць Або, баючыся высадкі нямецкаго войска. На рубяжох Фінляндзіі ішлі новыя бітвы паміж чырвонай і белай гвардзіей (Tägl. Rundschau).

БЭРЛІН. 20 г. м. (W.T.B.). У Гельсінгфорсе і Выбаргу, як кажуць уцекачы с Фінляндзіі, чырвоная гвардзія збурыла усякі парадак. Найгорш дзеецца у Гельсінгфорсе. У Макілёры рэгулярнае фінскае войско здрадзіло белую гвардзію, выдаўшы яе чырвонай, катарая разстрэляла белагвардзейцаў. Гельсінгфорская газэта чырвонай гвардзіі піша, што прыказ аб ачышчэнні Фінляндзіі ні будзя прызнаным. Фінляндская белая гвардзія мусіць паддацца і тады рэвалюцыя перакінецца у Швэцыю. Уцекачы просяць даць помач фінляндскаму народу, паслаўшы нямецкае войско.

МАДРЫД. (20 г. м. Reutv). Маўра атрымаў датручэнне саставіць габінэт міністраў.

БЭРЛІН. [22 г. м. W. T. B.] Рэйхстаг прыняў у другім і трэцім чытанню надзвычайны бюджэт і новые военные крэдыты на 15000000 мар. проціў галасоў нізалежных соцыялістаў.

БЭРЛІН. (27 г. м.) 20 сакавіка у вялікай зале засяданняў Рэйхстагу адбылася нарада у справе нямецкіх надбалтыйскіх правінцыяў пры учасьцію курляндскіх дэлегатаў. С прамовамі выступалі барон Радэн і адвакат Мельвіль з Лібавы. Усе прамоўцы гаварылі аб жычэнні Курляндзіі звязацца з Гэрманіяй пэрсональнай уніяй і энэргічна выступалі проціў басьні, што нібыто прылучення Курляндзіі да Гэрманіі хочуць только Курляндскія бароны і прусскія юнкеры. Ні только краёвая Рада, але і краёвае сабранне у верасьні 1917 г. на якім апрача немцаў былі латышы высказалася за цясьнейшая злучэнне з Гэрманіяй.

——

Страты дзержаў згоды у гандлёвым флоце.

Згодна с паведамленнем з Бэрліну ад Шэфа Адміральтэйства — ад 15 г. м.— у месяцу лютым затоплена 680000 тоннаў брутто. Разам з быўшымі раней, страты непрыяцеля ад пачатку ніабмежнай падводнай вайны зайшлі за 10270000 норм. тоннаў. Уся лічба стратаў непрыяцеля ад пачатку вайны да 31 студзеня 1918 года зьмераецца у 15000000 н. т.

З гэтай лічбы 9400000 н. т. прыйходзіцца на ангельскі гандлёвы флот.

На Беларускім шляху.

З пасядзэния Рады Беларускай Народнай Рэспублікі 24/III.

Пасядзэння адкрылася заявою Старшыні І. Н. Серады аб прысутнасьці на пасядзэнню дэлегатаў Віленскай Беларускай Рады п. п. А. Луцкевіча, І. Луцкевіча, Я. Станкевіча, і Г. Туркевіча.

Рада прывітала гасьцей воплясками. Пасьля таварыш Старшыні І. Я. Варонка сказаў прамову аб значэнні Вільні у гісторыі беларускаго нацыянальна-культурнаго адраджэння і заслугах перад ім нікаторых с прысутных дэлегатаў Віленскай Рады. «Беларусы!—закончыў прамову п. Варонка,—сягоння маем Вялікдзень, сягоння зноў духоўна аб'едналіся Вільня і Менск, душа і цела, сягоння беларус ўваскрос!»

Адказваў па прывітанне старшыня Віленскай Беларускай Рады п. А. Луцкевіч, каторы зрабіў вялікае павядамлення аб чыннасьці беларускіх арганізацыяў у Віленшчыне і Гродзеншчыне і даў здавальняючы атказ на усе запытання, зробленныя членамі Рады ў звязку с паведамленням.

Пасьля гэтаго Рада уставаннем атдала пашану памяці вядомай беларускай пісьменніцы, культурнаго і палітычнаго дзеяча—Цёткі—Пашкевіч.

Далей у парадку дзенным сятала прапазыція Беларускай Соцыялістычнай Грамады разглядзець праэкт аб'яўлення нізалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Прапазыція выклікаўшы пратэст адной часьці Рады, была арынята большасьцю галасоў.

Паведамленне аб цяперашнім становішчу Беларусі і тых прычынах, якія вымагаюць аб'яўлення яе нізалежнай Рэспублікай зрабіў Старшыня фракцыі Белар. Соц. Грамады А. А. Смоліч.

Нарада над гэтым пытанням цягнулася 10 гадзін. З абоіх бакоў выступіла 26 прамоўцаў.

Пры наэлектрызаваным паветры была прынята пераважнай большасьцю галасоў пастанова нададзеная «нізалежнікамі»: *Рада Беларускай народнай рэспублікі аб'яуляе Рэспубліку нізалежнаю і аб гэтым выдае стасоуную Устауную грамату».*

Местовая група падала голас проціў пастановы, але засталася у Радзе. Земцы, у ліку дзевяці чалавек, на чале с старшынёю Менскаго Губэрнскаго Земства заявілі аб выходзе. [п. п. Злобін, Матюш, Шыманскі, Міланович, Жылінскі і др.]

Ат падачы голасу утрымаліся прэдстаўнікі аб'еднанай Габрэйскай С. П. і «Поалэй-Ціон».

Прынятце пастановы спаткало шумнае прывітання Рады ўслаўах: «Ніхай жыве Нізалежная Беларуская Народная Рэспубліка».

А. С.

Адозва Менскаго Беларускаго Прэдстауніцтва.

«Менскае Беларускае Народнае Прэдстаўніцтво кліча усіх верных сыноў Беларусі, каторым даражаць палітычным, эканамічным і культурным адраджэннем краю, злучыцца каля яго, бо німа другога нацыянальнаго і межпартыйнаго органу, каторы мог бы дабіцца усіх гэтых задавняў.

Менскае Беларускае Прэдстаўніцтво дзеля дасягнення гэтых мэтаў, лічыць патрэбным:

1) Адбудаванне і разьвіцце Беларускай дзяржаўнасьці у граніцах разсялення беларускаго племяні;

2) Урэгуляванне беларуска-літоўскіх дзяржаўна-народных адносін на асновах супольнаго будаўніцтва і зьвязку с Курляндзіей дзеля аднаўлення старых гандлевых дарог да мора;

3) Падтрыманне зьвязку з вялікай цэнтральнай дзяржавай, каторая адна толькі можа забезпечыць народу права на самаадзначэнне;

4) Для паляпшэння быту і здавальнення патрэб селянства —правядзэнне грунтоуная зямельнай рэформы, каторая-б павялічыла надзелы дробных земляўласьнікаў і дала-б можнасьць надзяліць беззямельных батракоў зямлёю на рахунак вялікіх земляўласьнікаў, зямель скарбовых і другіх;

5) Завясьці зараз-жа, паводлуг магчымасьці, народныя беларускія школы і вучыцальскія сэмінарыі;

6) Выданне школьных беларускіх падручнікаў, арганізацыя народных беларускіх хат дзеля культуры і прасьветы;

7) Падгатоўчая работа, каб завесьці новае упраўленне краем;

8) Правядзенне справядлівай і гістарычнай і дзяржаўнай граніцы з Украінай;

9) Супольная праца з гэрманскімі окупацыйнымі уласьцямі, каб завесьці новы парадак і добрабыт краю».

ВАЙНА.

Павэдлуг урадаваго паведамлення германскаго вярхоўнаго камандавання за 25 сакавіка 1918 г. на захаднім фронце кронпрынцам Рупрэхтам баварскім, за помачу армій генералау фон-Белова (Отто) і фон-дэр-Марвіц пад Бапомам разьбіу непрыяцеля. Корпусы генералау фон-дер-Борне, Біндывіст і Кюне прарвалі моцныя пазыцыі у паўночна усходнім кірунку ад Бапома, а войска генералау Грынерт і Штабс адкінулі непрыяцеля за Іпр і Сайі ні уважаючы на моцнае і упорнае старанне непрыяцеля ні адступаць. У начной біцьве Бапом перайшоу да звыценжцау.

Армія генерала фон. Гутье—вайсковай група германскаго кронпрынца прарвалася праз Сомму ніжэй Ам. і з упорным боям узыйшлі на высоты на заход ад Соммы.

Да вечару штурмом узята м. Несль.

За Краза—каналам, паміж Соммай і О аз 23/3 наша войска узяла боям пазыцыі на заходнім беразе каналу, адкінуушы не прыяцеля за ніпраходные лясы і заля-невіль і Віляньe-Омон. Учора наступленне цегнулася далей.

Вечарам узяты Покайр і Шані.

Дальнабойнымі гарматамі немцы бамбардзіралі фартэцыю Парыж.

Да гэтаго часу зарэестравано 45000 палонных, больш за 600 гарматау, тысячы куляметау, агромністые склады баеваго матыр'ялу, інжынэрнаго меня, вялікіе запасы харчоу і амуніцыі.

Пад Вэрдэнам пягнууся артылерыйскі бой.

На другіх фронтах нічога новаго.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Абвестка.

Кантора паліцмэйстра знаходзіцца на Койданоускай в. № 28. Просьбы аб пазваленні сходау павінна быць падаваны за 10 дзен уперад. Газэты тагды толькі могуць друкаваць абвесткі аб сходах, калі сходы дазвалены паліцмэйстрам.

У пазычкова-ашчадным таварыстве.

У звязку з надзвычайнымі акалічнасьцямі у апошні час апэрацыі—глаўным чынам, выдача пазычак—зменшыліся да мінімуму.

У мінулые гады, да вайны, пасядзэчня рады т-ва адбываліся што тыднёва па аўторкам. На іх часамі разглядалося да 200 заяваў аб пазычках, якія выдаваліся да 500 рубл.

Цяпер пасядзення бываюць ні часьцей аднаго разу на 3 тыдні і заяваў для разгляду зьбіраецца ні больш 15-20.

Пазычкамі таварыства карысталі найбольш людзі з украінной месцовой беднаты: вазнікі, рамесьнікі, пасэсары зямель, жалезнадар. агенты і др., якіе атрымоўвалі пажычкі пад заклад меня, альбо паручыцельства 2-3 паплатных домаўласьнікаў.

Упадак спраў т-ва ні раз ужо наводзіў думку, каб яго зачыніць, але кіраўнікі, ведаючы карысьць, якую яно прыносіць нізаможным гарадзкім жыхаром, утрымовуюцца ад гэтаго кроку: тымболей, што пры т-ве есьць гандлёвы аддзел, каторы адпушчае сваім членам за даступную цану харчовыя прадукты, так сама авёс і інш.

Да рэчы прыпішым, што цукру гандлёвы аддзел ні мае ужо болей году.

Піва.

Вядомаму ўласьніку піваварнай хвірмы «Брацця Лекерт» нямецкай ўладаю выдана дазваленне на прывоз у Мінск нескольких вагонаў ячменю для прыгатавання піва 16° моцнасьці, якоя у блізшым часе з'явіцца у прадажы—«распівочно і на вынос!»

Аб згарэушым архірэйскім дворцу.

14 сакавіка у 9 вярстах ад Мінску, у Архірэйскай дачы зрабіўся пажар, якім знішчаны усе глаўныя будынкі, службы, жывёла і рыбалоўля. Есьць думка што прычына пажару—нечае злоснае падпаленне. Стаўшыя ахвярай полымя будынкі каштавалі вялікія грошы, стаўляліся «гаспадарскім спосабам» і адзначаліся пекным стылем і густоўным аздабленнем з надворку і ў сярэдзіне. Будоўляныя работы пачаліся пры б. архіяпіскапе Міхаіле і скончаны за часоў Мітрафана.

Фундушы на будоўлю ішлі із сум каморы архірэйскаго дому, якія складаліся глаўным чынам с пасасорскіх чыншаў на пляцы, каторыя у месьце і за местам займаюць абшар у 1800 дзесяцін.

Дзьве трэціх часткі агульнаго даходу у 40000 р. за гэтыя землі адпісываліся у фундуш Сыноду.

Апрача астальных 13000 р. у даход каморы паступала $^1/_2$ часьць скарбоннаго прыходу крэстовай царквы, што разам давало звыш 15000 р. з гэтай суммы толькі 1000 р. ідзець на утрыманне хору. А ўсе у астатку—чысты даход.

На чугунцы.

Пэнсіі паравозных машыністау с 425 у месяц—упалі цяпер на 280 рубл. Само ж упрауленые Л. Р. ж. д. бадай і саусім скасуецца, бо немцы маюць свае акруговае у Вільні, а адзел гэтаго упрауленыя —у Гродні. Пры нямецкай ашчаднасьці і акуратнасьці—гэтаго ім хваце і на Мінскі вокруг.

Дэлегатам служачых у кантролі Л. Р. ж. д. немцы абецалі заплаціць за сакавік і красавік (марэц і апрэль) служачым толькі палову пэнсіі.

Рэгістрацыя ваенных.

Салдатам з весак яуляцца да воінскаго—пакуль што ня трэба. Перапісываць іх ня будуць, бо яны патрэбны на мейсцох для гаспадарскіх работ. Рэгістрацыя афіцэроу ідзе іш чэ і цяпер, хоць тэрмін быу толькі да 13-го.

У воінскаго начальніка быушым служачым у саюзах, на ж. д. і т. д. ня трэба рэгістравацца, бо яны ня былі у радох арміі, так сама і тым з ніх, каторые по 443 ст. перэчыслены былі у войска толькі на паперы.

Калі не справяцца усіх зарэгістрыраваць, то рэгістрацыя будзе працягнута.

Усе, каторые выбіраюць з участкау пасведчання аб тым, што яны маюць работу, павінны дастаць на яго печаць нямецкаго паліцмэйстра, а потымісьці да воін. начальніка.

Духоуная сэмінарыя просіць у гэрманскаго ураду даць пропускі у Расію сэмінарыстам. Учэнне канчаецца 30 м.

Друкарня Я. А. [illegible]